# Аб рэдкім фальшывым талеры, датаваным 1610 г.

Андрэй КАРАЧ



Член ГА «Беларускае нумізматычнае таварыства»,
Рэспубліка Беларусь, г. Гродна,
e-mail: andrew_karach@tut.by



*Падробка талера княства Браўншвейг-Вольфенбютль 1610 г.*

***Малюнак 1***




*Арыгінальны талер*

***Малюнак 2***

Прынята лічыць, што фальшываманецтва з'явілася адразу са з'яўленнем першых манет. З часам мяняліся спосабы вытворчасці манет, і кожны раз фальшываманетчыкі імкнуліся не адставаць ад перадавых тэхналогій у манетнай справе. Манету меншага памеру падрабіць значна прасцей, чым манету большага памеру. Таму падробкі манет кшталту талера не сталі масавай з'явай. А сапраўды якасных падробак зусім няшмат, бо магчымасць выяўлення падману пры прыняцці вялікай манеты павышаецца ў разы. Падобныя манеты заўсёды разглядалі ўважліва, але, нягледзячы на суровыя пакаранні, хапала ахвотных займацца такой складанай і рызыкоўнай справай.

Падробка еўрапейскага талера 1610 г. *(малюнак 1)* была знойдзена падчас палявых работ у 2017 г. каля в. Адэльск Гродзенскага р-на, практычна на мяжы з Польшчай. Асновай для вырабу падробкі стаў талер княства Браўншвейг-Вольфенбютль 1610 г. *(малюнак 2)*, які быў выбіты ў гады праўлення Генрыха Юлія (1564–1613). Гэта княства размяшчалася на тэрыторыі Ніжняй Саксоніі, было часткай Свяшчэннай Рымскай імперыі і мела права біцця сваёй уласнай манеты. Трэба адзначыць, што арыгінальныя талеры дастаткова рэдка трапляюцца на нашых землях і ў скарбах практычна не сустракаюцца.

Вага падробкі – 27,13 г. Вага арыгінальнай манеты складае 29 г. Дыяметр адпавядае арыгіналу – 40 мм. Выявы і легенда цалкам капіруюць арыгінал, але, напрыклад, на рэверсе ў некаторых месцах дрэнна бачны дробныя дэталі і нават літары ў легендзе. Увагу прыцягваюць вельмі нізкі рэльеф і мелкія ямкі на полі манеты. Гэта месцы, дзе былі бурбалкі паветра, і метал туды не здолеў патрапіць раўнамерна. Такім чынам, можам упэўнена сцвярджаць, што гэты фальсіфікат зроблены метадам ліцця.

Тэхналогія была наступнай: расплаўлены метал залівалі ў загадзя падрыхтаваную манетную форму, і пасля застывання гэта маса ператваралася ў манету. Потым неабходна было прыбраць літнік – месца, з якога ў загатоўку заліваўся метал. Сляды літніка можна ўбачыць на аверсе манеты на 12 гадзін – акурат над галавой «дзікуна». Пасля апрацоўкі манеты ёй трэба было прыдаць «срэбны выгляд» і пакрыць тонкім слоем каштоўнага металу. Найбольш папулярным быў метад ртутнай амальгамы – калі падрыхтаваную рэльефную загатоўку змяшчалі ў раствор ртуці і расплаўленага срэбра. Пры гэтым пасля выпарвання ртуці на паверхні заставаўся тонкі слой срэбра. Такі слой быў не вельмі трывалым, але фальшываманетчыкам большага і не трэба было. Манета «ішла ў спра-

ву», і праз некаторы час каштоўны метал пачынаў знікаць, але знайсці таго, хто перадаў манету, ужо было практычна немагчыма.

На *малюнку 3* бачна, як выглядала форма для ліцця талера (з літнікам) пачатку XVII ст. Яна была знойдзена на Паўночнай Украіне. З яе дапамогай рабілі фальшывыя талеры г. Ульм, датаваныя 1620 г. Форма для ліцця талера – рэч сапраўды ўнікальная, экзэмпляраў засталося зусім няшмат.

Тэхналогія падробкі манет шляхам ліцця была дастаткова простай, але не надта эфектыўнай. У XVII ст. для вытворчасці срэбных манет буйных наміналаў пачаў выкарыстоўвацца вінтавы прэс. Гэта прывяло да далейшага ўдасканальвання манетнай вытворчасці, і колькасць літых падробак пачала паступова змяншацца.

У пачатку XVII ст. на тэрыторыі ВКЛ талерная манета яшчэ не набыла значнага распаўсюджвання і не была вядомай для шырокага кола насельніцтва. Хутчэй за ўсё, гэты экзэмпляр патрапіў да нас з Еўропы, а не з'яўляўся прадметам мясцовай вытворчасці. Таму фальсіфікаты талераў з'яўляюцца ўнікальнымі помнікамі грашовага абарачэння перыяду Новага часу.



*Форма для ліцця талера (г. Ульм, 1620 г.)*

***Малюнак 3***

## About the Rare Counterfeit Thaler Dated 1610

**Andrey KARACH,** *Member of the Public Association «Belarusian Numismatic Society», Grodna, Republic of Belarus, e-mail: andrew_karach@tut.by.*

**Abstract.** *The article is dedicated to the counterfeiting of the European thaler of 1610. The bases for production became the thaler of the Brunswick – Wolfenbuttel Principality of 1610, which was struck during the reign of Heinrich Julius (1564 – 1613). At early 17th century the thaler coins were not widespread in the lands of Belarus. That is why this coin is not the subject of mass production and, most likely, was brought to Belarus from Europe.*